Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Сярэдняя школа № 21 г. Магілёва”

*Міжнароднаму дню беларускай мовы прысвячаецца…*

# “ГУЧЫ, БЕЛАРУСКАЕ СЛОВА!”

моўны марафон у 3 класе

***Стваральнікі,***
***настаўнікі пачатковых класаў:***
Разанава Наталля Віктараўна
Чаркасава Вольга Браніславаўна
Старажэнка Ірына Мікалаеўна
Малашанка Ганна Іванаўна
Самусенка Дар'я Уладзіміраўна

Магілёў
2024

## Моўны марафон «Гучы, беларускае слова!»

**Мэта:** папулярызацыя роднай мовы, беларускага слова

**Задачы:**

- раскрыць прыгажосць беларускага слова;
- узбагаціць слоўнікавы запас вучняў тэматычнай групай слоў;
- развіваць творчыя здольнасці ў паэтычным чытанні, уменне працаваць у камандзе;
- выхоўваць любоў і павагу да роднай мовы і культуры.

**Абсталяванне:** кніжная выстава, карткі з заданнямі, малюнкі, партрэты пісьменнікаў.

**Ход мерапрыемства**

**I. Арганізацыйны этап**

*(Гучыць песня «Родная мова» (сл. Геніюш. Муз. Кацікава) у выкананні Валерыя Дайнекі)*

**Настаўнік.**

- Якая прыгожая, мілагучная песня на роднай мове прагучала і запрасіла нас да ўдзелу ў моўным марафоне «Гучы, беларускае слова!», прысвечанага Міжнароднаму дню роднай мовы.

**II. Асноўная частка**

**Вучань**

«Родныя словы, магутныя словы, простыя словы… Для кожнага чалавека самыя блізкія – словы роднай мовы. Родная мова – душа народа. Пакуль жыве мова, жыве і народ.

Дзяды і бацькі нашу мову стваралі,
Каб звонка звінела, была як агонь.

**Настаўнік**

-Дзе б ні быў беларускі чалавек, заўсёды ў яго сэрцы жыве родная мова. На працягу стагоддзяў прыгожае гучанне роднага слова маленькі беларус пачынае ўспрымаць з матчыных песень, цудоўных беларускіх казак, легенд, паданняў. Пра Беларусь кажуць: «Тут зямля спявае».

**Вучні чытаюць верш Л. Полазавай «Родная мова».**

Вы паслухайце родную мову:
Жаўруковаю песняй звініць...
Колькі фарбаў, адценняў у слове!
Як пявуча ліецца-гучыць!
Васількамі, рамонкамі шэпча

У квяцістых раздольных лугах.
Гулкім рэхам гамоніць у зарэччы,
Салаўінаю траллю у гаях.
То шчымліва, журботна галосіць,
То вясёлкай над борам плыве.
Так у госці ласкава запросіць,
Так бяседу гасцінна вядзе!
Хай жа іскрыцца сонцам вясенннім,
Спелым коласам нівы шуміць!
У карагодзе кружыць вясельным.
Веру: мова мая будзе жыць!
Мілагучная і ласкавая!
Не згубілася ў цемры вякоў.
Мой святы пасаг, мая спадчына
Мова родная, мова бацькоў!

**Настаўнік.**

- Мова — душа народа, плён працы многіх пакаленняй, люстэрка духойнага жыцця народа, наш галоўны нацыянальны скарб. А вы ведалі, што беларуская мова прызнана ЮНЕСКА другой у свеце па мілагучнасці пасля італьянскай? Наша мова вельмі лёгка кладзецца на музыку, і атрымліваюцца вельмі прыгожыя песні. Калыханка - адна з самых распаўсюджаных у свеце песень. Яе спяваюць немаўлятам матулі ва ўсіх кутках планеты, каб супакоіць дзіця. (Развучванне калыханкі)

**Вучань.**

- Зараз я хачу падзяліцца цікавымі фактамі пра беларускую мову. Літаратурная беларуская мова надзвычай багатая: па розных адзнаках, яна налічвае ад 250 000 да 500 000 слоў.

Скульптурным увасабленнем адметнасці нашай мовы з’яўляецца помнік літары «ў» у Полацку (2003 год).

Згодна з данымі апошняга перапісу насельніцтва, носьбітамі беларускай мовы ў краіне з'яўляюцца каля 6 340 000 яе жыхароў. Па гэтым крытэрыі наша мова займае 69 месца ў сусветным рэйтынгу.

Венгерскі матэматык Андраш Корнай аднёс яе да ліку бясспрэчна жывых.

**Настаўнік.**

Не проста ў словы я гуляю –
На мове роднай размаўляю.

- Прапаную выканаць гульнёвыя заданні.

***1 заданне “Шыфраванка”.***

- Якія беларускія словы зашыфраваны?

| | А | Б | В | Г |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Л | Д | Ж | О |
| 2 | Э | К | А | І |
| 3 | Ь | К | Ы | Т |
| 4 | С | Ш | Ў | А |

| | А | Б | В | Г |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Ь | З | Х | І |
| 2 | Ю | В | Ц | К |
| 3 | П | Ф | Л | Р |
| 4 | С | Ч | М | А |

3Б, 2В, 1А, 4Г, 4А, 2Б, 2Г    2Б, 4Г, 4А, 1Г, 3В, 1А, 2Г,1Г

К А Л А С К І    В А С І Л Ь К І

**2 заданне «Хвіліна эрудытаў»**

- Якім псеўданімам падпісваў свае творы Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч? (Якуб Колас)

- Каго называюць беларускім першадрукаром? (Францішка Скарыну)

- Што называюць «беларускім морам»? (Возера Нарач)

-Каго называюць нябеснай заступніцай зямлі беларускай? (Еўфрасінню Полацкую)

**3 заданне «Кемлівыя і знаходлівыя»**

Гульня ў настолькі “Назаві па-беларуску”, “Лексічны калейдаскоп”

**4 заданне «Хто хутчэй?»**

Закончыце прыказку:

Няма смачнейшай вадзіцы, як з роднай … . (крыніцы)
Для ўсякай птушкі сваё гняздо … . (міла)
Родная зямелька як зморанаму … . (пасцелька)
У сваім краі, як у … . (раі)
Далёкая старонка без ветру … . (сушыць)
На чужыне і камар … . (загіне)
Кожнаму свой куток … . (мілы)
Усюды добра, а дома … . (лепей)

Кожная сасна свайму бору песню … . (пяе)
Жыць — Радзіме … . (служыць)

**5 заданне " Рыфмоўка"**

Дабаўце рыфмаваныя словы, каб атрымаўся верш.

<u>Словы для даведак</u>: **шукаць, баравічок, падбярозавік, сыраежка, шапкай, нагінаецца, грыбнога.**

Пасля дожджыку……………
Раз, два, тры, чатыры, пяць.
Дзед грыбы ідзе………… .
Там, дзе грыб трапляецца,
Нізка ………………… .
Выбегла да сцежкі
Краля- …………… . .
Вырас пад бярозкаю
Стройны …………. .
Паміж купін маслячок.
Пад яловай лапкай
Таўстунок- …………..
Пад рудою ………. .
У бары іх вельмі многа
Пасля дожджыку……………. .

**III. Заключная частка**

Закончыць моўны марафон хачу вершам Пятруся Броўкі *"Калі ласка"*.

**Відыёролік Эвеліна Дунчанка. Верш П. Броўкі «Калі ласка».**

У любімай мове, роднай, наскай,
Ах, якія словы: "Калі ласка!.."
Як звіняць яны сардэчнаю струною,
Праз усё жыццё ідуць са мною.